# Чытаем беларускую кнігу

2012 год рашэннем урада нашай краіны аб'яўлены Годам кнігі. На яго працягу ўсе публічныя бібліятэкі Гродзеншчыны плануюць правесці шэраг мерапрыемстваў па папулярызацыі беларускіх выданняў, у тым ліку конкурс "Чытаем беларускую кнігу".

З сённяшняга, першага выпуску беларускай старонкі "Скарбонка" мы пачынаем друкаваць агляды цікавых беларускіх кніг, падрыхтаваныя работнікамі бібліятэк.




**Дучыц, Л. Сакральная геаграфія Беларусі/Людміла Дучыц, Ірына Клімковіч. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 383 с.: іл.**

Аўтары кнігі больш за 10 гадоў вандруюць па Радзіме, наведваючы самыя патаемныя яе куточкі, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў міфах і паданнях нашага народа (сакральны ў перакладзе з лацінскай мовы – "свяшчэнны"). Абагаўленне прыроды праяўлялася ў кульце азёр і рэк, крыніц, дрэў, курганоў, пячор, легенды складаліся пра святых і багоў, гарадзішчы, дарогі, старажытныя могілкі. Кожны раздзел кнігі прысвечаны той ці іншай частцы нашага сакральнага ландшафту. Яна дапамагае даведацца пра гісторыю сваёй мясцовасці і ўзгадаць, дзе знаходзіцца "Нявесцін камень", альбо чаму гара каля Ваўкавыска называецца Шведскай.




**Прыгодзіч, З. Постаці: З цэлым народам гутарку весці... / Зіновій Прыгодзіч. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011. – 310 с.**

У кнізе змешчана 10 творчых партрэтаў знакамітых дзеячаў беларускай культуры, 10 гутарак з тымі, каго мы называем творцамі, падзвіжнікамі нацыянальных здабыткаў. Гэта пісьменнікі Янка Сіпакоў і Анатоль Сульянаў, сын Якуба Коласа Міхась Міцкевіч, прафесар Адам Мальдзіс і скульптар Іван Міско, кампазітар Леанід Захлеўны і харавы дырыжор Міхась Дрынеўскі, рэжысёр Валерый Анісенка і актрыса Марыя Захарэвіч, мастак Георгій Паплаўскі.

Кніга карысная для тых, хто неабыякавы да роднай культуры, цікавіцца жыццём і творчасцю яе прадстаўнікоў.


**Падрыхтавала Людміла КАРАНКЕВІЧ, галоўны бібліёграф аддзела краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага.**



**Вядучая выпуска – Тамара МАЗУР.**